| | | |
|---|---|---|
| 1. Запішыце нумар правільнага выказвання: | Беларуская мова належыць да<br>1) балцкай групы моў;<br>2) раманскай групы моў;<br>3) славянскай групы моў;<br>4) іранскай групы моў. | Беларуская мова ўваходзіць у<br>1) заходнеславянскую групу моў;<br>2) усходнеславянскую групу моў;<br>3) паўднёваславянскую групу моў. |
| 2. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Значная роля ў станаўленні беларускага пісьменства належыць асветнікам 12 ст.:<br>1) Кірылу Тураўскаму;<br>2) Сімяону Полацкаму;<br>3) Кліменту Смаляцічу;<br>4) Андрэю Рымшу. | Значная роля ў станаўленні беларускага пісьменства належыць асветнікам 12 ст.:<br>1) Льву Сапегу;<br>2) Івану Ужэвічу;<br>3) Аўраамію Смаленскаму;<br>4) Ефрасінні Полацкай. |
| 3. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | У 14 ст. падчас валадарання князя Альгерда мова продкаў сучасных беларусаў называлася<br>1) “простая мова”;<br>2) “язык словенкий”;<br>3) “ русский язык”. | Старабеларуская мова выкарыстоўвалася ў пісьмовых зносінах на тэрыторыі<br>1) Віленшчыны;<br>2) усёй дзяржавы (ВКЛ);<br>3) Полацкага княства. |
| 4. Падбярыце адпаведныя пары і запішыце іх нумары: | 1) Ф.Скарына а) “Катэхізіс”;<br>2) С.Будны б) “Евангелле”;<br>3) В.Цяпінскі в) “Псалтыр”. | 1) Л.Зізаній а) “Апостал”;<br>2) Ф.Скарына б) “Лексіс”;<br>3) В.Цяпінскі в) “Евангелле”. |
| 5.Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Найбольш развітымі галінамі тэрміналогіі ў 14-17<br>стст. былі:<br>1) грамадска-палітычная; | У Статуце ВКЛ адзначаюцца:<br>1) зацвярдзенне шыпячых і *р*;<br>2) пераход у-ў праз ужыванне літары *в*; |

| | | |
|---|---|---|
| | 2) спартыўная;<br>3) юрыдычная;<br>4) гандлёвая;<br>5) хімічная;<br>6) сельскагаспадарчая;<br>7) промыславая;<br>8) ваенная. | 3) ужыванне канчатка *–у (-ю)* ў назоўніках мужчынскага роду адзіночнага ліку роднага склону;<br>4) ужыванне канчатка *–а (-я)* ў назоўніках мужчынскага роду адзіночнага ліку роднага склону;<br>5) выкарыстанне прыстаўных галосных і зычных. |
| 6. Запішыце нумар правільнага выказвання: | У 19 ст. свядома стаў апрацоўваць жывую мову беларускага народа<br>1) Я.Чачот;<br>2) В.Дунін-Марцінкевіч;<br>3) В.Равінскі. | Адным з першых у 19 ст. загаварыў аб беларускай мове як найважнейшым элеменце нацыянальнай культуры беларускага народа і ўзняў пытанне пра яе лёс<br>1) У.Сыракомля;<br>2) Я.Лучына;<br>3) Ф.Багушэвіч. |
| 7. Запішыце нумар правільнага выказвання: | Заснавальнікам беларускага мовазнаўства, аўтарам працы “Беларусы” з’яўляецца<br>1) К.Каліноўскі;<br>2) Я.Лёсік;<br>3) Я.Карскі. | Найбольшы ўклад ва ўнармаванне беларускай мовы на пач. 20 ст. унесла газета<br>1) “Мужыцкая праўда;<br>2) “Наша ніва”;<br>3) “Гоман”. |
| 8. Запішыце нумар правільнага выказвання: | Палітыка беларусізацыі<br>1) была прысвечана разгляду пытанняў аб рэформе беларускага правапісу і азбукі; | З выдадзеных у 1918 г. найбольш аўтарытэтнай і дасканалай была |

| | | |
|---|---|---|
| | 2) садзейнічала ўзмацненню русіфікатарскай палітыкі;<br>3) садзейнічала ўкараненню беларускай мовы ў шырокую грамадскую практыку. | граматыка<br>1) Я.Лёсіка;<br>2) Б.Тарашкевіча;<br>3) А.Луцкевіча. |
| 9. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Адзінкамі спецыяльнай лексікі з’яўляюцца:<br>1) онім;<br>2) номен;<br>3) паронім;<br>4) тэрмін. | Паводле сферы ўжывання ў лексіцы беларускай мовы вылучаюць наступныя групы:<br>1) агульнаўжывальная;<br>2) эмацыянальна-экспрэсіўная;<br>3) абмежаванага ўжытку. |
| 10. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Прыметы тэрміна:<br>1) экспрэсіўнасць;<br>2) сістэмнасць;<br>3) дакладнасць;<br>4) кароткасць;<br>5) адназначнасць. | Віды наменклатурных сістэм:<br>1) прыродазнаўчая;<br>2) назвы прафесій;<br>3) назвы лекаў;<br>4) номены, што выступаюць на правах уласных імён. |
| 11. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Тэрмінамі з’яўляюцца:<br>1) сыр “Радзівіл”;<br>2) аксіёма;<br>3) лінейнае ўраўненне;<br>4) Віцебск;<br>5) куб рознасці. | Номенамі з’яўляюцца:<br>1) бісектрыса;<br>2) В.Быкаў;<br>3) цукеркі “Ліса-махлярка”;<br>4) фен “Алеся”;<br>5) біквадратнае ўраўненне. |
| 12. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | З’яўленне гэтых тапонімаў прадвызначыў прыродна-кліматычны фактар:<br>1) Рачэнь;<br>2) Баравіца;<br>3) Татаршчызна;<br>4) Міснікі; | З’яўленне гэтых тапонімаў прадвызначыў фактар дамінуючай вытворча-гаспадарчай дзейнасці:<br>1) Агароднікі;<br>2) Азярцо; |

| | | |
|---|---|---|
| | 5) Лясішча. | 3) Кавалі;<br>4) Грамніцы;<br>5) Журбінская Буда. |
| 13. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Прыведзеныя словы з’явіліся шляхам тэрмінаўтварэння:<br>1) поле;<br>2) складанне;<br>3) інтэграл;<br>4) сегмент;<br>5) адлегласць. | Былі запазычаны наступныя тэрміны:<br>1) лагарыфм;<br>2) косінус;<br>3) канал;<br>4) лічнік;<br>5) цыліндр. |
| 14. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Звязаныя кампаненты грэчаскага паходжання:<br>1) ***антрапа-;***<br>2) ***гальвана-***;<br>3) ***тэрма-***;<br>4) ***кіла-;***<br>5) ***фона-.*** | Звязаныя кампаненты лацінскага паходжання:<br>1) ***рэнтгена-;***<br>2) ***радые-***;<br>3) ***відэа-***;<br>4) ***серва-;***<br>5) ***авія-.*** |
| 15. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Тэрміны-словы:<br>1) дроб;<br>2) S-падобны;<br>3) абарачальная функцыя;<br>4) мноства;<br>5) дыферэнцыраванне. | Тэрміны-словазлучэнні:<br>1) каардынатная плоскасць;<br>2) касеканс;<br>3) уран-235;<br>4) корань ураўнення;<br>5) разгорнуты вугал. |
| 16. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Агульныя тэрміны-назоўнікі адзіночнага ліку:<br>1) сіметрыя;<br>2) фінансы;<br>3) дадэкаэдр; | Агульныя тэрміны-назоўнікі адзіночнага ліку:<br>1) рэсурсы;<br>2) кантыянства;<br>3) стэрэаметрыя; |

| | | |
|---|---|---|
| | 4) меню;<br>5) прапарцыянальнасць. | 4) вышыня;<br>5) хібнасць. |
| 17. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя:<br>1) ст**а**тут;<br>2) ф**е**тыш;<br>3) катал**о**г;<br>4) в**ы**падак;<br>5) дысп**а**нсер. | Выдзеленыя літары абазначаюць націскныя галосныя:<br>1) **а**гент;<br>2) кварт**а**л;<br>3) п**а**сквіль;<br>4) ж**а**люзі;<br>5) таб**у**. |
| 18. У якіх словах не супадае колькасць гукаў і літар: | 1) унічыю;<br>2) мільярд;<br>3) пяшчотны;<br>4) ручаіна;<br>5) п’яўка. | 1) аб’інець;<br>2) каўказскі;<br>3) маёр;<br>4) варэнне;<br>5) павільён. |
| 19.Адзначце правільна напісаныя словы: | 1) натарыат;<br>2) іарданец;<br>3) рэгіён;<br>4) ажыятаж;<br>5) арыентацыя. | 1) перыёдыка;<br>2) кліянтура;<br>3) імпрэсарыо;<br>4) шпіон;<br>5) ідэолаг. |
| 20. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | На месцы пропуску пішацца ***ь*:**<br>1) студзен...скі;<br>2) восем...;<br>3) п...едэстал;<br>4) шэсц...;<br>5) барэл...еф. | На месцы пропуску пішацца апостраф:<br>1) суб...ектыўны;<br>2) пяц...сот;<br>3) бар...ер;<br>4) аб...яднанне;<br>5) міл...ён. |
| 21. Адзначце словы, у якіх на | 1) інт...грал; | 1) адр...зак; |

| | | |
|---|---|---|
| месцы пропуску пішацца літара ***э***: | 2) д...таль;<br>3) лід...р;<br>4) бухгалт...р;<br>5) ц...ліндр. | 2) парал...лаграм;<br>3) экстр...мум;<br>4) інж...нер;<br>5) ш...снаццаць. |
| 22. У напісанні якога слова дапушчана памылка: | 1) ландшафтны;<br>2) Кранштат;<br>3) міласэрднасць;<br>4) кампостны;<br>5) кантрастны. | 1) Аксіння;<br>2) каментар;<br>3) цэллюлоза;<br>4) карозія;<br>5) перон. |
| 23. Адзначце нумары слоў, у якіх прапушчана літара: | 1) тэр...ыторыя;<br>2) кня...ства;<br>3) бязла...дзе;<br>4) сцюдзё...ны;<br>5) бес...істэмны. | 1)кал...ектыў;<br>2) хара...ство;<br>3) Шмі...т;<br>4) семян...ы;<br>5) бес...ардэчны. |
| 24. Адзначце назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць канчатак ***-а***: | 1) фінал;<br>2) квадрат;<br>3) сезон;<br>4) твар;<br>5) падручнік. | 1) сход;<br>2) цыліндр;<br>3) аловак;<br>4) век;<br>5) гадзіннік. |
| 25. Адзначце лічэбнікі, якія запісаны правільна: | 1) з пяцістамі тысячамі;<br>2) у шасцідзесятую кватэру;<br>3) каля дзевяцісот відаў;<br>4) шэсць дзесятых кілаграма;<br>5) з дваццацю сямю турыстамі. | 1) чатырма словамі;<br>2) васьмістамі цэнтнерамі;<br>3) у абодвых словах;<br>4) сямісот старонак;<br>5) трыццаць сямі наведвальнікам. |
| 26. Адзначце лічэбнікі, у якіх на месцы пропуску пішацца ***е***: | 1) тыс...ча;<br>2) аб...дзвюма;<br>3) с...мнаццаць; | 1) дзвесц...;<br>2) с...мёра;<br>3) п...цьдзесят; |

| | | |
|---|---|---|
| | 4) ш...сцьсот;<br>5) дзесяц...ра. | 4) ш...сцістам;<br>5) дз...вяты. |
| 27. Адзначце словазлучэнні, у якіх лічэбнік і назоўнік дапасаваны правільна: | 1) два рубля;<br>2) метраў за пяцьсот;<br>3) дзве чацвёртыя;<br>4) трое зайчанят;<br>5) дзве трэціх. | 1) кіламетраў за сорак;<br>2) два хлопца;<br>3) тры алоўка;<br>4) дзве пятых;<br>5) чацвёра акуляраў. |
| 28. Адзначце словазлучэнні з памылковым ужываннем роду назоўнікаў: | 1) надаедлівы цэцэ;<br>2) чырвоны гваздзік;<br>3) неразборлівая подпіс;<br>4) чыстая цюль;<br>5) дзесятковая дроб. | 1) старажытны летапіс;<br>2) маленькая кенгуру;<br>3) сонечны Сочы;<br>4) высокая насып;<br>5) залаты медаль. |
| 29. Адзначце словазлучэнні з памылкамі ў кіраванні: | 1) звярнуцца на адрас;<br>2) у сарака кіламетрах ад горада;<br>3) старэйшы інспектар;<br>4) характэрны яму;<br>5) загадчык аддзела. | 1) адыгрываць уплыў;<br>2) выконваючы абавязкі;<br>3) больш дзесяці год;<br>4) дзякаваць усіх;<br>5) хварэць грыпам. |
| 30. У якіх словазлучэннях дзеепрыметнікі напісаны або ўжыты няправільна: | 1) сціснутае паветра;<br>2) пасівеўшыя пасмы;<br>3) пачарнелы з гора;<br>4) правеенае жыта;<br>5) загнаны конь. | 1) пачырванелыя пальцы;<br>2) навееныя думкі;<br>3) накормленае дзіця;<br>4) вымытыя талеркі;<br>5) устанавіўшыеся сувязі. |
| 31. Адзначце словазлучэнні, у якіх парушана лексічная спалучальнасць слоў: | 1) дажджлівая восень;<br>2) пясочны бераг;<br>3) галасавы певень;<br>4) галіновае дрэва;<br>5) мудрагелістыя ўзоры. | 1) засушлівы лісток;<br>2) жаноцкае адзенне;<br>3) арэшнікавы кій;<br>4) эфектыўныя меры;<br>5) аб’ёмісты канспект. |
| 32. Адзначце пары слоў, якія | 1) хадзіць – хадзіла; | 1) раздарожжа – ростань; |

| | | |
|---|---|---|
| адрозніваюцца лексічным значэннем: | 2) пісьмовы – пісьменны;<br>3) лінгвістычны – мовазнаўчы;<br>4) абагуліць – абагульніць;<br>5) аўтабіяграфія – біяграфія. | 2) спрактыкаваны – вопытны;<br>3) жнівеньскі – жніўны;<br>4) старшыня – старшына;<br>5) павіннасць – правіннасць. |
| 33. Адзначце словы, якія адносяцца да лексікі абмежаванага ўжытку: | 1) жыта;<br>2) чалавек;<br>3) цяперака;<br>4) дэфіс;<br>5) здароўе. | 1) крыніца;<br>2) бацян;<br>3) радасць;<br>4) прадвесне;<br>5) флексія. |
| 34. Адзначце словы, якія адносяцца да спецыяльнай лексікі: | 1) акустыка;<br>2) вырай;<br>3) падарожнік;<br>4) спрэчка;<br>5) пратакол. | 1) хмара;<br>2) фасад;<br>3) перапынак;<br>4) вёрстка;<br>5) асіміляцыя. |
| 35. Адзначце фразеалагізмы: | 1) малоць пшаніцу;<br>2) кляваць носам;<br>3) малоць языком;<br>4) кляваць зерне;<br>5) рукой падаць. | 1) павесіць нос;<br>2) фарбаваць падлогу;<br>3) табаку важыць;<br>4) згусціць фарбы;<br>5) шмат важыць. |
| 36. Адзначце кніжныя фразеалагізмы: | 1) абіваць парогі;<br>2) альфа і амега;<br>3) краевугольны камень;<br>4) гнуць спіну;<br>5) яблык разладу. | 1) кануць у лету;<br>2) блёкату наеўся;<br>3) дамоклаў меч;<br>4) наступаць на пяткі;<br>5) ахілесава пята. |
| 37. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Прыметы афіцыйна-справавога стылю:<br>1) вобразнасць;<br>2) непасрэднасць маўлення;<br>3) строгая аб’ектыўнасць; | Прыметы навуковага стылю:<br>1) ацэначнасць;<br>2) строгая дакладнасць;<br>3) лагічнасць; |

| | | |
|---|---|---|
| | 4) канкрэтнасць;<br>5) эмацыянальнасць. | 4) пафаснасць мовы;<br>5) афіцыйнасць. |
| 38. Адзначце стыль, у якім ужываюцца наступныя словы (словазлучэнні): | ***парламент, дэбаты, сацыяльны статус, сімпозіум***:<br>1) публіцыстычны;<br>2) навуковы;<br>3) афіцыйна-спраўавы;<br>4) гутарковы;<br>5) мастацкі. | ***сінус, вектар, лінейнае ўраўненне, бісектрыса***:<br>1) публіцыстычны;<br>2) навуковы;<br>3) афіцыйна-спраўавы;<br>4) гутарковы;<br>5) мастацкі. |
| 39. Запішыце нумары ўсіх правільных выказванняў: | Жанры мастацкага стылю:<br>1) санет;<br>2) рэпартаж;<br>3) аповесць;<br>4) рэцэнзія;<br>5) камедыя. | Жанры навуковага стылю:<br>1) дысертацыя;<br>2) акт;<br>3) рэферат;<br>4) балада;<br>5) даведка. |
| 40.Запішыце нумар правільнага выказвання: | У сказе: ***Прадстаіць рэзка ўзмацніць барацьбу за паляпшэнне якасці выпускаемай прадукцыі***<br>1) парушана чысціня маўлення;<br>2) сказ адпавядае ўсім патрабаванням культуры маўлення;<br>3) парушана дакладнасць маўленя. | У сказе: ***У найкарацейшы тэрмін наша краіна шагнула ад масавай непісьменнасці да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі***<br>1) парушана дакладнасць маўлення;<br>2) сказ адпавядае ўсім патрабаванням культуры маўлення;<br>3) парушана чысціня маўлення. |